**Традыцыі.** У выставачным комплексе Нацыянальнай бібліятэкі правялі майстар-клас па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Наведвальнікам прапанавалі зрабіць асаблівае велікоднае яйка. Урок майстэрства можна было атрымаць ад майстра народнай творчасці па росписе яек воскам у тэхніцы «пісанка» Вольгі Хачковай, кіраўніка народнай студыі дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Бусляня» Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, распавялі ў НББ. Такім чынам працягваецца цыкл майстар-класаў Нацыянальнай бібліятэкі з вядомымі народнымі майстрамі краіны ў рамках выставачнага праекта «Жывыя крыніцы», прымеркаванага да Года гістарычнай памяці.

**Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ**